# *ДЫЯЛОГ ЯК СЭНС ЖЫЦЦЯ*

**21 лістапада 2023 года ў створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Грамадскай літаратурнай школе прайшоў другі занятак па тэме «Мастацкія дэталі. Дыялог». У межах занятку адбылася прэзентацыя кнігі Аліны Сабуць «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў».**

Пра гэтую кнігу ўжо нямала сказана, напісана. І яна сапраўды заслугоўвае павышанай увагі, таму што паведамляе чытачу вынікі цэлага шэрагу фундаментальных даследаванняў, прадпрынятых яе аўтарам – навукоўцам філолагам і філосафам мастацтва слова як наватарам, першаадкрывальнікам. Актуальная сутнасць гэтых даследаванняў заяўлена ў назве кнігі. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы разглядае літаратурны працэс як форму дыялогу, як спосаб існавання чалавека ў мастацтве і суіснавання з магічнай прыгажосцю і жыватворнай сілай айчыннай літаратуры. Важнасць гэтых даследаванняў пацверджана і самай высокай літаратурнай узнагародай – Нацыянальнай літаратурнай прэміяй Беларусі, якой у 2023 годзе ўдастоена аўтар кнігі.



Нешматлікія, на жаль, слухачы, якія прыйшлі на сустрэчу з галоўнай кнігай айчыннай літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства апошніх гадоў і яе аўтарам, былі зачараваныя захопленым расповедам госці. Без усялякага сумнення, многім захацелася лепей вывучыць беларускую літаратуру, шмат новага прачытаць і яшчэ больш даведацца ў гэтай сферы. Калі слухаеш Аліну Эдмундаўну, гартаеш яе кнігу – пачынаеш разумець, што філасофія літаратуры, яе дыялагічна-кантэкстуальны характар – гэта філасофія жыцця, набор эстэтычных правілаў і нормаў паводзін сучаснага гарманічнага чалавека, асаблівасцяў яго мыслення і светапогляду, чалавека як часткі Сусвету, бязмежнага і да канца неспазнанага. Вось некаторыя тэматычныя вектары кнігі, якія вучоны, педагог, асветнік падчас прэзентацыі прапанавала нашай літшколе пасля знаёмства з кампазіцыяй выдання:





- дыялогавыя мадэлі ў Коласавым нашаніўскім публіцыстычным маўленні: «Я – Вы (беларусы, браткі, галубочкі, саколікі)»: «“Чаму вы, беларусы, так скора адракаецеся ад свайго народа?” – пытаў у мяне калісь-та мой стары вучыцель»;
- дыялогавая мадэль «Я – ты» з арыгінальным, метафарызаваным зваротам *«Ты, …пакутнік-вучыцель»*: *«Калі ж дачакаеш ты лепшай долі, пакутнік-вучыцель, чорны волік на пустой ніве народнай асветы?»;*
- рытарычныя пытанні (рытарычны пытальна-адказавы ход):
1) Мадэль «Я – Вы» з рытарычным пытаннем: *«А дзе вы знайдзеце такую беднату, як у нас?»;*
2) Мадэль «Я – Я» з рытарычным пытаннем: *«Я пытаю аб народных вучыцелях у шырокім значэнні гэтых двух слоў. Як жывуць яны? – я пытаю»;*
3) Мадэль «Я – Сусвет» з рытарычным пытаннем: *«Як жа праводзіць дні і чым жыве гэта дзетвара?»;*
- дыялагічнасць мыслення М. Багдановіча;
- аўтарскі зварот-развага да чытача, што правакуе да дыскусіі (пра запаветы М. Гарэцкага, пра М. Багдановіча);
- аўтарскае запрашэнне да дыскусіі-разважання пра тое, што “Новая зямля” Якуба Коласа – настольная кніга для кожнага беларуса:
- аўтарскае запрашэнне да дыскусіі-роздуму актуалій дня (чым сёння можа асабліва пахваліцца беларуская літаратурная крытыка?
- аўтарская правакацыя да дыскусіі з чытачом (праз філасофска-аналітычныя развагі);
- дыялагізацыя з чытачом / маналагізацыя (з паслядоўным абгрунтаваннем, з рытарычным пытальна-адказавым ходам, з акцэнтна-сцвярджальнымі анафарычнымі паўторамі… і інш.);
- аўтарскі дыялог з сабою або запрашэнне да роздуму, пошуку з папярэдняй аргументацыяй;
- аўтарскія рытарычныя пытанні ў развагах пра паэтычную філасофію А. Апанасевіча;
- аўтарская аргументацыя літаратурна-мастацкага трыо: тэкст → падтэкст → кантэкст.

Выступленне Аліны Эдмундаўны Сабуць і знаёмства з кнігай «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў» выклікалі цікавую рэакцыю з боку слухачоў нашай літшколы. Прагучалі рэфлексіі, заўвагі, пытанні, разважанні. Літаратурныя дыялогі адбыліся і перайшлі ў мастацкія пошукі. Як адзін з доказаў таму – верш-экспромт, верш-прысвячэнне падзеі і яе галоўнай дзеючай асобе, напісаны падчас прэзентацыі кнігі Аліны Сабуць паэтэсай Аленай Руж *(на фота ніжэй)*.

**Елена РУЖ**

# Знак вечности

*Алине Сабуть посвящается*

*"Напісанае застаецца…"*
*Алесь Петрашкевіч*

Собираю книгу по крупицам –
важное, не важное – как знать?
Предо мною будущего лица –
Эти строки будут ли читать?

В книге мои чувства, мысли, страхи,
удивление и боль потерь.
Красота и беспристрастность славы
открывают не обложку – дверь.

Я пишу о том, что наболело –
белые заполнены листы.
Здесь мой опыт жизни и стремлений –
это для читателей мосты…

Книга вышла – целая эпоха!
Для меня бессонница и  страсть.
Как непросто ожиданье сроков!
Книга – это вечности печать.

*Гродно, 21.11.2023*

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На здымках:** Гродзенская грамадская літаратурная школа вывучае тэму «Мастацкія дэталі. Дыялог». У рамках другога тэматычнага занятку адбылася прэзентацыя кнігі кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі ў намінацыі «літаратурная крытыка і літаратуразнаўства» Аліны Сабуць «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў». Гродзенскі офіс Саюза пісьменнікаў Беларусі, 21 лістапада 2023 года.


ГРАМАТА


ДЫПЛОМ
ПАДЗЯКА
ДИПЛОМ






ВЕРАСЕНЬ
КАСТРЫЧНІК






КАРИНА
ДЕМИНА
ДОСТОЯНИЕ






Аліна Сабуць
ЛІТАРАТУРНЫЯ ДЫЯЛОГІ


ВЕРАСЕНЬ 2023
Адукацыя – найлепшае багацце!
КАСТРЫЧНІК 2023
ПАДЗЯКА
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ
ГА "САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"




Адукацыя – найлепшае багацце!
ОКТЯБРЬ OCTOBER КАСТРЫЧНІК 2023
ЛІСТАПАД 2023
ЗА СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ КНІГІ І ЧЫТАННЯ Ў 2022 ГОДЗЕ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ ГА "САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"








ЛІТАРАТУРНЫЯ ДЫЯЛОГІ






***Фота*** Анатоля Апанасевіча [www.pisateli.by](http://www.pisateli.by)